

Жыве Беларусь!

ПАГОНЯ

Рэгіянальны агляд: Беласток — Горадня — Вільня

№ 4 (18) 26 лютага — 4 сакавіка 1993 г. Кошт 3 рублі

«КІТАБУ» АДМОВІЛІ

Мы ўжо пісалі, што актывісты гарадзенскага грамадзка-культурнага аб ´яднаньня «Кітаб» па ўзгадненьню з мясцовымі ўладамі на сродкі арабскіх краін і ахвяраваньні вернікаў-мусульман паспрабавалі стварыць ў межах Горадні гуманітарны дзіцячы лагер, мэтай якога было б аздараўленьне дзяцей-мусульман, ахвяр сербска-басьнійскага канфлікту.

Каб паскорыць утварэньне лагеру, кіраўніцтва аб ´яднаньня «Кітаб» даслала ліст на імя старшыні ВС Рэспублікі Беларусь. Днямі на адрас мусульманскага рэлігійнага аб ´яднаньня прыйшоў адказ ад старшыні камісіі па нацыянальнай палітыцы і пытаньнях СНД М.Сьлямнёва за № 22-5/310/505, у якім паведамляецца: «В настоящее время, искренне сочувствуя людям, попавшим в беду, Р. Беларусь не имеет возможности для принятия беженцев Боснии. Это связано с кризисным явлением в ее экономике, а также с тем, что, как вам известно, из зоны радиоактивного заражения, вызванного катастрофой на Чернобыльской АЭС, необходимо переселить около 2-х миллионов человек. Это требует колоссальных затрат. Кроме того, в связи с распадом СССР и конфликтными ситуациями в ряде республик бывшего СССР, в Беларуси каждый день приезжают беженцы и переселенцы, которые также нуждаются в срочной помощи».

Такі вось нечаканы адказ тым, хто жадае дапамагчы людзям, якія трапілі ў бяду. Дзіўна, бо гэты лагер арганізатары зьбіраліся фундаваць не за кошт дзяржавы, а за лік дапамогі урадаў мусульманскіх краін. Шкада, бо на гэтым гарадзенскія мусульмане не спыніліся і накіравалі сваю дэлегацыю ў Маскву з прапановай расейскаму ўраду стварыць такі ж лагер на тэрыторыі Расеі.

Г. АСТРОЎСКІ.

НОВАЕ ПРАЎЛЕНЬНЕ КАФ «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

У ЗАЛЕ Гарадзенскага дому культуры адбылося паседжаньне агульнага сходу сяброў КАФ «Бацькаўшчына». На сходзе прысутнічала 48 чалавек. Прысутныя заслухалі справаздачны даклад старшыні рэвізійнай камісіі аб фінансава-гаспадарчай дзейнасьці фонду за 1992 год.

На падставе дакладу сябры сходу прызналі фінансава-гаспадарчую дзейнасьць КАФ «Бацькаўшчына» станоўчай. Каб забясьпечыць плённую працу ўсіх структур фонду, па прапанове старшыні спадара Маркевіча былі абраны шляхам адкрытага галасаваньня чатыры новыя сябры праўленьня. Імі сталі М. Патрэба, А. Жукоўскі, К. Жынь і А. Майсяёнак.

Л. ВАСІЛЕЎСКІ.

СЮРПРЫЗ З ЧЭХІІ

ДОЎГА,— з чэрвеня мінулага года падарожнічалі прызы міжнароднага конкурсу дзіцячага малюнка, перш чым трапілі па адрасе,— у Гарадзенскую мастацкую школу. Відаць, адпраўлялі іх арганізатары па прывычных каналах,— спачатку ў Маскву, а потым ужо ў Беларусь. Вось і затрымалася дзесьці пасылка...

А што ж у той пасылцы? Ганаровыя дыпломы лаўрэатаў буйнога міжнароднага конкурсу, які традыцыйна праводзіўся кожны год у Чэхіі, у горадзе Лідзіцэ. У мінулым годзе ў гэтым конкурсе ўдзельнічалі выхаванцы Гарадзенскай гарадзкой дзіцячай мастацкай школы Вольга Рапекта, Сьвятлана Іаскевіч, Дзіма Ціханоўскі. Яны адправілі ў Лідзіцэ свае малюнкі і сталі лаўрэатамі.

Якраз цяпер у фае кінатэатра «Гродна» адкрыта выстава работ навучэнцаў гарадзкой мастацкай школы. Зазірніце туды, і вы перакананецеся, як многа ў нашым горадзе таленавітых дзяцей!

М. Д.

ПАЛЯКІ НЯ ТОЛЬКІ ТРЭНІРУЮЦЦА Ў ГОРАДНІ...

ТРЭНІРОВАЧНЫ збор правялі ў Горадні футбалісты з польскага горада Ломжа. Для іх гэта абышлося таньней, чым у родных сьценах.

Госьці згулялі некалькі кантрольных матчаў з гарадзенскімі камандамі. Сустрэчу з «Кардан флаерз», напрыклад, яны завяршылі ўнічыю — 2:2. Так што зборы былі карыснымі для ламжанскіх футбалістаў. Да таго ж яны дамовіліся аб пераходзе ў сваю каманду гульца аднаго з гарадзенскіх клубаў. Імя навабранца пакуль трымаюць у сакрэце: пераход павінен афіцыйна зацьвердзіць Польскі футбольны саюз.

М. МІХАЙЛОВІЧ.

Маляваў С. ХАРЭЎСКІ, г. Вільня.

НА ЎШАНАВАНЬНЕ ПАМЯЦІ М. ТКАЧОВА

Усведамляючы ўсенароднае значэньне дзейнасьці аднаго са сваіх заснавальнікаў, БСДГ аб ´яўляе збор сродкаў на ўшанаваньне памяці Міхася Ткачова. Калі вы, паважаныя спадары, захочаце падтрымаць гэтую высакародную справу, то можаце пералічыць ахвяраваньні на бягучы рахунак Гарадзенскай філіі БСДГ 700609 у рэг. кам. банку «Комплекс», код 152101714 *з паметай*: «На ўшанаваньне памяці М. Ткачова».

Сабраныя сродкі пойдуць: на памятныя дошкі ў г. Гродна, горадзе, у якім прайшлі найбольш плённыя для навукі гады М. Ткачова; на ўстаноўку помніка на магіле Міхася Ткачова ў г. Менску і на фундацыю імяннай стыпендыі для студэнта Гарадзенскага універсітэта, які паспяхова займаецца праблемамі беларускага сярэднявечча або нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі.

Шчыра ўдзячны Вам за Ваш уклад!

ІЗНОЎ НАЗІРАЕЦЦА РОСТ ДАЛЯРА

Амаль два апошнія тыдні кошт даляра трымаўся практычна на адным узроўні. Нават назіралася яго паніжэньне. Аднак пачатак тыдня не заставіў ніякіх сумненьняў, што і надалей курс даляра будзе расьці. Дарэчы, ангельскі фунт без дзесяці капеек каштуе ўжо тысячу рублёў, відаць, хутка гэта станецца і з далярам...

Курс валют банка «Комплекс» у Горадні 25 лютага

Даляр ЗША	660	698
Нямецкая марка	397	434
Ангельскі фунт	887	999.90
Француcкі франк	101	126

М. ЖЫЛЕЎСКАЯ.

«У беларусаў Польшчы павінны быць свае нацыянальныя палітыкі...»

Магчыма, у недалёкай будучыні ў Польшчы ды і ў нас на Беларусі загучыць новае імя. Беларускую моладзь у Польшчы не задавальняюць адно толькі Купальле ды «Басовішча».

Яцак Пракапюк — малады палітык, які лічыць, што прысьпеў час ня толькі гаварыць, але і рабіць справу.

— **ЯЦАК, ты зьяўляешся лідэрам ініцыятыўнай групы, якая вядзе падрыхтоўку па стварэньню нацыянал-лібэральнай партыі, прычым мяркуецца, што партыя гэтая будзе заснавана як партыя крайне правага накірунку. Чым абумоўлены вашыя памкненьні і ваш радыкалізм?**

— У той складанай палітычнай сітуацыі, у якой апынулася сёньня Польшча, павінны зьявіцца людзі, якія папросту здолеюць выразна і пераканаўча гаварыць аб праблемах польскіх беларусаў, дамагацца іх становчага вырашэньня, для якіх ня будзе асноўнаю мэтаю шукаць кампрамісы з існуючымі партыямі і рухамі. Мы

— **Ідэя крайняга лібэралізму не існуе ўжо даволі працяглы час.**

— Так, калі гаварыць аб Польшчы, то крайні лібэралізм скончыўся тут напрыканцы XIX стагоддзя, бо ўжо ад тае пары існавала дзяржаўнае кіраваньне гаспадаркай. Але мы думаем, што абавязак дзяржавы — стварыць як мага больш магчымасьцей для разьвіцьця любога чалавека. Гэта яе абавязак, і калі гэтыя магчымасьці зьяўляюцца, то кожны нармальны чалавек павінен іх скарыстаць. Таму адным з галоўных нашых праграмных накірункаў ёсьць адкрыцьцё гаспадарчых межаў.

— **Якія палітычныя накірункі вы плануеце абраць у сваёй дзейнасьці?**

— Перш-наперш мы думаем стварыць і абавязкова ажыцьцяўляць на Беласточчыне, там, дзе яшчэ існуе беларускае асяроддзе, пазытывісцкую праграму разьвіцьця саміх беларусаў, зрабіць так, каб беларусы неразмываліся ў польскім асяроддзі. Мы будзем увесь час дамагацца (а для гэтага выкарыстоўваць усе законныя сродкі ўзьяднаньня), каб беларусы ў Польшчы мелі фактычна роўныя правы і магчымасьці з грамадзянамі польскай нацыянальнасьці.

— **У Польшчы дзейнічае Беларускае грамадзка-культурнае таварыства. Ці маеце вы якія-небудзь стасункі з гэтай арганізацыяй?**

БГКТ створана польскім урадам, каб звольніць бябе ад абавязкаў дзяржаўнай падтрымкі беларускай нацыянальнай меньшасьці. Дзяржаўныя чыноўнікі выступаюць за тое, каб беларусы самі рабілі свае імпрэзы, фэсты, фальклёрныя сьвяты. Таварыству даюць невялікія грошы, фінансуюць газэту «Ніва». І ім гэта выгодна, бо БГКТ ня робіць нічога, акрамя бяскрыўдных культурных мерапрыемстваў. Але ж у беларусаў, якія жывуць у Польшчы, павінна быць і свая нацыянальная палітыка і свае нацыянльныя палітыкі.

— **Якімі будуць вашыя першыя практычныя захады пасьля рэгістрацыі?**

— Па-першае, трэба распачаць масавае выданьне статуту нашай партыі. Безумоўна, думаем выдаваць сваю газэту. Будзем спрабаваць уплываць на розных адказных асобаў на Беласточчыне, каб яны на самой справе дапамаглі беларусам у іх нацыянальным адраджэньні. Да таго ж будзем абавязкова супрацоўнічаць з беларускімі ліцэямі, каб яны не былі школаю атлумліваньня беларусаў, як гэта было і ёсьць зараз.

— **Што ж, дзякуй за размову і посьпехаў вам.**

Гутарыў С. КУНЕЖ.

Палітычная сцэна

АНТРАКТ СКОНЧАНЫ

Не-не, дый пачынаеш моцна сумнявацца: ці Эўропа ў нас тутака, ці пярэдадзень сёньня XXI стагоддзя? Бо 30-мі гадкамі тхне, а з вуліцы чуцён лямант партыйцаў: «З акопаў! Ура! Страляй іх!».

Варта было крыху больш месяца назад гарадзкой тапанімічнай камісіі сабрацца й абмеркаваць «прыгожыя» назвы гарадзенскіх вуліц накштал камуністычна-сацыялістычна-марксаўскіх, як неўзабаве купа разьюшаных пэнсіянэраў акупавала малую залу паседжаньняў гарвыканкама. Пільныя дзядкі, бач ты, надта ж узлаваліся, што камісія пасядала напярэдадні, аказваецца, угодкаў сьмерці іхняга куміра Ульянава-Бланка. Бедная тая камісія, якая не трымае ў галаве непатрэбную сабе інфармацыю...

Безцырымонныя наведнікі запатрабавалі ультыматыўна, каб быў звольнены неадкладна намесьнік старшыні выканкама А. Мілінкевіч, бо яны яго лічаць самым галоўным лідэрам БНФ... Старыя антыбеларусы дакладна ведаюць, што дзякуючы гэтаму чалавеку ў горадзе шмат што робіцца дзеля беларусізацыі, а таму чаму б і не вярзьці ўсялякія глупствы! А тут яшчэ вельмі «дарэчы» адвалілася пліта ад падмурка бронзавага помніка Ільічу — рэдкі козыр у рукі аматараў шукаць ва ўсім падкопы ЦРУ. І вось — людцы вы мае! — ледзьве ня цэлы выканкам вымушаны прыладжваць тую дурацкую пліту, якая ўсё адно ніяк не трымаецца, бо рабілі некалі ўвесь пляц разам з помнікам аўралам — да Кастрычніцкай дэманстрацыі...

Урэшце рэшт прыладзілі, вядома. А як жа не прыладзіць, калі адзін з актывістаў пэнсійнай групы захопа ў іншым месцы, ня сьцішваючы нават голасу, гразіўся расстраляць усю тапанімічную камісію... Вось так: нагуляліся ў дэмакратыю! КПСС на Беларусі рэанімавана, спраўдзіўся іранічны наваргодні прагноз «Пагоні». Засталося толькі гарэлку яшчэ зноў прадаваць па 3.62...

У Горадні ўтварылася «дзвюхуладдзе», бо замест аднаго абкаму КПБ (першы сакратар сп. Верхась), існуюць ажно два, бо выйшаў з падпольля папярэдні — КПБ, і яголы першы сп. Сямёнаў пасьпяшаўся правесьці пленум абкама, на які зьехаліся сакратары райкамаў вобласьці.

А на наступным тыдні адбылася яшчэ адна цікавая падзея. Рэдактары раённых газэт вобласьці сабраліся на нараду ў памяшканьні «Гродненской правды» і раптам у залу цьвёрдай хадою ўваходзіць ідэялагічны аддзел дапутчавага абкаму ў складзе сп. сп. Біруковай, Таранцея і Амелькі, якія сёньня займаюць значна сьціплейшыя пасады. Утварылася сцэна з гогалеўскага «Рэвізора», а сёй-той з рэдактараў у думках нават перахрысьціўся, хоць ніколі ў Бога ня верыў. Дзіва што, бо падобныя нарады калісьці праводзілі нашыя слаўныя ідэолагі, якіх правінцыйныя рэдактары багомілі й баяліся. Пасьля скасаваньня клясічнай мізансцэны адбылася «зацікаўленая» гутарка ў дырэктыўнай афарбоўцы.

Атрусіўшыся пасьля акопаў, партыйцы перайшлі ў атаку. Напачатку яны распаўсюдзілі на заводах, а таксама паўкідалі ў паштовыя скрынкі ўлёткі, зьмест якіх — зьняважаньне дзяржаўных сімвалаў Беларусі — выкрывае іхніх аўтараў як крымінальных злачынцаў. Асабліва вольна пачуваюцца камуністы на заводзе аўтамагнітолаў. Далей яны пачалі зьбіраць па кватэрах подпісы супраць перайменаваньня бальшавіцкіх вуліц. І людзі падпісваюць, а потым яны зноў вернуцца да ўлады... А баяцца ёсьць чаго, бо дзе камуністы, тамака — парушэньне правоў чалавека, скалечаныя лёсы, гора, сьлёзы, кроў, дзесяткі мільёнаў бязвінных ахвяраў, карацей кажучы — камуністычны лад жыцьця, камунізм.

25-га лютага гэтыя людзі прадставяць сэсіі гарадзкога Савету ультыматум: забараніць на тры гады вяртаць старажытным вуліцам іхнія нармальныя назвы. Будзе шкада, калі людзі добрай волі не выкажуць сваіх адносінаў да бальшавіцкай акцыі. Потым можа быць і запозна: мізантропы вяртаюцца, узьнімаюць галаў, дыктуюць і паграджаюць. Іншая мова ім невядома.

Беларусы, ачомайцеся! А беларусы тым часам адзначаюць сьвята, якое больш не існуе, прычым сьвяткуюць нават тыя, хто ніколі ў тых СА і ВМФ не служыў і самае страшнае — школьнікі, ад адзінаццага класа практычна па першы...

Крыху аптымізму дадае толькі той факт, што жанчыны-парафіянкі Фарнага касьцёлу правялі контракцыю й сабралі 510 подпісаў у падтрымку ініцыятывы вярнуць вуліцам старажытнай каралеўскай Горадні іхнія сапраўдныя, а не абразьліва-недарэчныя бальшавіцкія назвы.

М. ІВАНЧЫК.

● *Музэі*

ВЫБАЧАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА...

Пад час Другой Сусьветнай вайны цэнтр Менска быў літаральна зьнішчаны фашыстоўскай авіяцыяй. Але, па адзнаках спэцыялістаў, з помнікаў гісторыі й культуры горад цалкам страціў толькі адзін — домік-музэй 1-га зьезду РСДРП. Пасьля вайны ён быў адбудаваны. І хаця старажылы сцьвярджаюць, што стаіць ён цяпер не на тым самым месцы, але з-за таго, што доўгія гады ўваходзіў ва ўсе турыстычныя маршруты, быў найбольш наведваемым музэем Менска. Таксама сюды абавязкова прыводзілі студэнтаў й школьнікаў сталіцы. І хаця экспазіцыя была створана вядомым на Беларусі мастаком, заслужаным дзеячом мастацтваў, уладальнікам Дзяржаўнае прэміі Рэспублікі Беларусь (за стварэньне экспазіцыі музэя Максіма Багдановіча) сп. Эдуардам Агуновічам, зьмест яе за апошнія часы, мягка кажучы, састарэў. Рэальна гэта ўсьведамляючы, калектыў музэя зачыніў яго з мэтай пабудовы новае экспазіцыі. Але за апошні год гэты будынак аказаўся ў віры падзей. Першы скандал узьняўся пасьля таго, як у музэі вырашыў абаснавацца нейкі амэрыканскі бізнэсмэн, выдаткаваўшы за гэта грошы на перабудову экспазіцыі. Зразумела, гэта выклікала абурэньне ў вэтэранаў бальшавіцкае партыі, якія наладзілі пікеты. Амэрыканскаму «арыгіналу» прыйшлося зьехаць, але страсьці ня сьцішыліся. І вось з 1-га студзеня музэй зноў гасьцінна расчыніў свае дзьверы, выконваючы патрабаваньні ўсё тых жа вэтэранаў. Але вы ўжо ня ўбачыце побач турыстычных аўтобусаў. І стаіць самотна зялёны дамок на сваёй вуліцы Камуністычнай, што праходзіць па самым беразе Сьвіслачы. А перад уваходам вісіць цыдулка, у якой супрацоўнікі музэя просяць прабачэньня ў наведвальнікаў. За тое, што яны там убачаць.

А. ЛАНІЦКІ, г. Менск.

Фатаграфаваў А. УЛАДАСЕВІЧ

З БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫМ СЬЦЯГАМ — У «ЧЫРВОНЫЯ ПАМЕШЧЫКІ»?

Ня ведаю дакладна, можа, дзе на Беларусі і ёсьць старшыні калгасаў, якія адкрыта падтрымліваюць пазіцыі БНФ. Але наўрад. Бо вельмі ўжо розьняцца іх інтарэсы і пазіцыі народнафронтаўцаў. Але падобна, што прэзыдэнт неўзабаве можа зьявіцца: сваю кандыдатуру на пасаду старшыні калгаса «40 год Кастрычніка», што на Салігоршчыне, выставіў лідэр мясцовай Даўгаўскай суполкі БНФ Рыгор Рыгоравіч Кулік. Па яго словах, цяперашняе кіраўніцтва сустрэла ягоную заяву літаральна ў штыкі. Не дае доступу да дакументацыі, каб прэтэндэнт мог вывучыць становішча спраў у гаспадарцы, дало каманду не пускаць на фермы для правядзеньня агітацыі за сябе.

Рыгор Рыгоравіч мае сельскагаспадарчую адукацыю па спецыяльнасьці інжынер-механік, вопыт работы на шэрагу адказных пасадаў, але ўжо працяглы час нідзе не працуе — не ўжываўся з начальствам, справядліва ці не абвінавачваюць яго ў розных злоўжываньнях. Летась паспрабаваў стаць фермерам, але няўдала: прапанавалі зямлі намнога менш, чым прасіў, і невялікімі, парасьціданымі шматкамі.

Цяжка сказаць, «пацягне» або не кандыдат ў старшыні такі нялёгкі воз. Але з яго кароткай праграмы вынікае, што ён нядоўга пацерпіць калектыўнае гаспадараньне ў цяперашнім выглядзе. На першым этапе яго рэфармаваньня ён мае намер паставіць ў непасрэдную залежнасьць заработную плату ўсіх спэцыялістаў ад старшыні да брыгадзіраў ад таго, што атрымліваюць іх падначаленыя. На ўсе пасады спэцыялісты павінны выбірацца на конкурснай аснове, тарыфныя стаўкі для іх прапаноўваецца адмяніць.

На другім этапе рэформы мяркуецца ператварыць калгас у акцыянэрнае таварыства.

Уся калгасная маёмасьць у выглядзе імянных акцый павінна быць разьмеркавана ня толькі паміж калгасьнікамі, але й паміж пэнсіянэрамі, усімі, хто некалі працаваў у калгасе, адпаведна стажу. Калі хто-небудзь не пажадае ўкладваць свае сродкі ў калектыўную вытворчасьць, ён мае права выдзяліцца і гаспадарыць самастойна.

Ня маючы ўпэўненасьці, што яму дазволяць хаця б выступіць са сваёй праграмай перад справаздачна-выбарчым сходам, які адбудзецца ў лютым, Рыгор Рыгоравіч зьвярнуўся з пісьмамі да старшыні раённага Савета народных дэпутатаў і ў мясцовую газэту.

В. МУРЫЛЕЎ.

● *Высновы*

АБ ХОНАР, АБ СЭНСУС

Былы ідэолаг ЦК КПБ, а яшчэ раней — старшыня парткаму Менскага гадзіньнікавага заводу т. Чыкін не сядзеў склаўшы рукі. Адразу пасьля забароны дзейнасьці кампартыі ён здолеў згуртаваць вакол сябе купку энтузіястаў і з'арганізаваў партыю камуністаў Беларусі (ПКБ), пасьпяшаўшы абвясьціць сябе правапрыемнікам былой КПБ. Ведаючы пра вялікую павагу У. І. Леніна да «Іскры», т. Чыкін з'арганізаваў газэту «Мы и время», якую пачалі распаўсюджваць (як ў былыя часы «Навіны БНФ») маладыя хлопчыкі ў менскіх электрычках.

Памятаючы свае ідэалагічнае мінулае, т. Чыкін вырашыў унесьці сваю лепту ў разьвіцьцё марксісцкае тэорыі. Патрэбны быў нейкі арыгінальны ход, і ён быў знойдзены. Прызнаўшы, што сацыялізм у СССР ня быў сапраўдным сацыялізмам, бо ня здолеў пазьбегнуць прымусовае працы, т. Чыкін напачатку года выступіў з вялікім праграмным артыкулам пад назвай «AB OVO»: «Давайте попробуем во всем спокойно разобраться. Начать, пожалуй, придется, как говаривал великий Гораций, ав ovo (от яйца)». І узяўшы на ўзбраеньне вядомую ленінскую тэзу пра тое, што стаць камуністам можна адно авалодаўшы ўсім багацьцем ведаў, якое выпрацавала чалавецтва, т. Чыкін хоча пабудаваць новае грамадзтва, якое будзе грунтавацца на дыктатуры ТАЛЕНТУ.

Зазначу адразу, што ў прынцыпе мне падабаецца такая пазіцыя. Мне прыемна ўжо тое, што т. Чыкін можа працытаваць Гарацыя, хаця троху не зразумела, чаму менавіта яго. Ён быў паэтам і філосафам. Калі зыходзіць з пазіцыі т. Чыкіна й пачынаць з паэзіі, дык у першую чаргу трэба зьвярнуцца да Гэсіёда. Калі пачынаць з філасофіі, тады трэба зьвярнуцца да Фалеса. І пачынаў бы я не з яйка — ведаем мы, адкуль яно ў курыцы выпадае, а з тых паняцьцяў, якія я вынес у назоў (думаю, што кожнаму беларусу зразумелы іх сэнс без перакладу).

Талент сам па сабе ні пра што ні гаворыць. Можна быць таленавітым, але рамесьнікам, таленавітым, але выканаўцам, таленавітым, але злачынцам. Наконт усяго багацьця ведаў... Яшчэ Геракліт казаў: «Шматведаньне розуму не навучае»... Зусім іншы вынік дае спалучэньне таленту й ведаў. Такі чалавек ужо ня можа быць шэрай пасрэднасьцю. Бо пра гэта даўным-даўно сказаў усё той жа Геракліт: «Мудрым можна лічыць толькі адно: Розум, які здатны кіраваць Сусьветам». Але кіруюць па-рознаму. Адны — з дапамогай крыві й страху, другія — уласным прыкладам самаахвяраваньня. Першыя — гэта пакрыўджаныя прыродай, закамплексаваныя тыраны. Яны нават зьнешне ўсе падобныя: Ірад, Нэрон, Вітаўт, Іван Грозны, Напалеон, Суворў, Ленін, Сталін. Другія — Хрыстос, Дантэ, да Вінчы, Касьцюшка, Агінскі...

Мая выснова: чалавек, які спалучыў у сабе талент і веды, ніколі ня стане камуністам. Але... Яшчэ больш за тысячу гадоў таму было напісана Плятонам: «Вялізная маса людзей па самае сваёй прыродзе — рабы, яны ня здатныя сабою кіраваць, і дзеля іх жа карысьці ім патрэбныя гаспадары», і Шан Янам: «Хто разумны — стварае законы, хто дурны — законам абмежаваны. Хто здольны — зьмяняе парадак, хто няздольны — той парадкам зьвязаны. З чалавекам, які зьвязаны парадкам, ня варта гаварыць пра справы, а з чалавекам, які абмежаваны законамі, ня варта гаварыць пра перамены». А таму дзеля нармальнага жыцьця патрэбны не ідэі, а добрыя законы. Над стварэньнем каторых чалавецтва й працуе ўжо не адну тысячу гадоў. Вось і ўсё, пра што хацелася сказаць.

Цікава, а якія стасункі цяпер будуць у т. Чыкіна з аднаўленай КПБ, правапрыемнікам каторай ён сябе лічыў? Я думаю, там, калі зноў дарвуцца да ўлады, дык ня будуць «мудрствовать лукаво».

Я. ДУБРОЎСКІ, г. Менск.

● *Пінск*

ПАЛЕСКІ ГЛЕЙ НА ДНЕ ЧОРНАГА МОРА

НАРЭШЦЕ знайшоўся адказ на пытаньне украінскіх навукоўцаў, адкуль паходзіць пагроза забруджваньня Чорнага мора глеем. Супрацоўнікі незалежнага экалагічнага клюба Пінска лічаць, што глей на дне Чорнага мора зьявіўся ў выніку актыўнай гідрамеліярацыі Палесься.

— Мы правялі досьледы,— распавёў карэспандэнту «Пагоні» удзельнік клюба лекар М. Дзікавіцкі,— і вызначылі, што ідзін літар дажджавой вады вымывае ў гідрамеліярацыйныя каналы каля трох грамаў глею. Далейшы шлях вызначыць проста: з каналаў магутныя насосныя станцыі выкачваюць усё ў рэкі і рэчкі Прыпяцкага басэйна, а па іх вада сьцякае ў Прыпяць і потым ужо па Дняпры трапляе ў Чорнае мора.

З гэтай нагоды экалягічны клюб Пінска лічыць неабходным спыніць далейшую гідрамеліярацыю Палесься, бо ў выніку такога гаспадараньня на месцы непраходных багнаў можа ўтварыцца пустэча, а Чорнае мора стане сапраўды чорным і атручаным.

Г. АСТРОЎСКІ.

● *Сходкі*

«САКРЭТНАЯ» НАЦЫЯ

ВІРАТЛІВЫ час. Складанае жыцьцё напаўняе наша існаваньне новым зьместам. Неабходна пільна сачыць за пераменамі, бо яны часьцей вядуць нас да недалёкай мінуўшчыны, чым ў цывілізаванае заўтра.

Вось і я, ідучы на сходку камуністаў, прысьвечаную 75-м угодкам былога першага сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава, спадзяваўся пачуць хоць што-небудзь новае, невядомае. На жаль, мае спадзеўкі разьвеяліся, як дым. Зала факультэта беларускай літаратуры й культуры Гарадзенскага дзяржаўнага унівэрсітэту больш чым напалову была запоўнена тымі, хто звыш сямідзесяці гадоў вёў нас да «сьветлай будучыні».

Адкрыў вечар таварыш Архіпаў. Ён пералічыў тых, хто быў ініцыятарам угодкаў, і даў слова прафэсару Верхасю. Прафэсар хвілін дзесяць тлумачыў вэтэранам, што таварыш Машэраў быў чысцейшай душы чалавек, яго прынцыповасьць павінна быць прыкладам усім сёньняшнім прадаўжацелям справы Леніна. Нагаварыўшыся ўволю, ён перадаў слова наступнаму. Як высьветлілася, гэта быў Пранько, блізкі сваяк нябожчыка. Доўга гаварыў Пранько, але так і не адужаў прывесьці хоць адзін прыклад з жыцьця былога першага, які б акрэсьліў яго геразім. Зала пасьля такога выступу пачала ўздыхаць, хваляваццa, а адзін з сядзячых побач мяне вэтэранаў зазначыў: «Нават сваёк чытае з паперкі, што ж тады казаць пра іншых». І мой сівагаловы сусед меў рацыю.

Наступны прамоўца Навумаў гаварыў такое, што ніяк не стасавалася да вечарыны. Замест таго, каб аддаць паваґу сьветлай памяці Машэрава, Навумаў пачаў ганіць дэмакратаў. Потым перанёсься на ўлады Горадні, якія на ўезьдзе ў горад з боку Друзкенік ўзялі дый скасавалі шыльду з выявай ордэна чырвонага працоўнага сьцяга, якім, з слоў прамоўцы, былі ўзнагароджаны рабочыя горада ў гонар чамусьці васьмідесяціпяцігадовага юбілею Горадні. Далей яшчэ болей узгадваў прамоўца самыя неверагодныя нечаканасьці. Ён гаварыў аб нейкай нацыі, якая дала сьвету такіх выдатных людзей, як А. Пушкін, Я. Колас, П. Машэраў, Т. Шаўчэнка. Шкада, што прамоўца так і ня вызначыў, хто ж такая гэтая нацыя.

Бралі яшчэ словы Архіпаў, Сасноўскі, Гарбачова, але ў іх прамовах ні я, ні прысутныя так і не пачулі, што ж такога выдатнага зрабіў нябожчык ў час вайны. Яны не прыгадалі ніводнай ваеннай апэрацыі, якую б распрацаваў ці ўзначаліў асабіста П. Машэраў. Рэфрэнам у прамовах было тое, што Пятро Міронавіч арганізаваў на Вілейшчыне ў час вайны камсамольскія арганізацыі ў тыле ворага і вельмі любіў канцэрты мастацкай самадзейнасьці. Ніхто не прыгадаў слухачам, чым жа вызначыўся Першы ў пасьляваенны час. Можа, проста тыя, хто выступаў, ня ведалі ці не пажадалі распавесьці прысутным праўду аб індустрыйнай гігантаманіі Першага, якая будавалася з элемэнтарнымі парушэньнямі норм бясьпекі акаляючага асяроддзя. Можа, яны забыліся пра гідрамэліярацыю Палесься і іншых рэгіёнаў Беларусі. Затое мы ведаем і без прамоў, што сталася з Палесьсем і да якіх шкод прывяло будаўніцтва гігантаў прамысловасьці.

Сьвята адбылося, можна, як кажуць, «падбіць бабкі». Імпрэза угодкаў па задуме арганізатараў павінна была ўзьвесьці юбіляра ў чын нацыянальнага героя беларускага народа. Наўрад ці здолелі справіцца з гэтай задумай арганізатары. Чаму? На мой погляд, таму, што нічога гераічна-беларускага не было ў гэтым звычайным партыйным функцыянеры. Па-другое, у самой структуры арганізацыі ўгодкаў не прысутнічала нічога беларускага. Прамоўцы, калі выступалі, не сказалі ніводнага беларускага слова, а наадварот, ціснулі на інтэрнацыяналізм. Як пацьверджаньне гэтаму, прагучаў урывак з паэмы «Камуніст», прысьвечанай нябожчыку нейкім маскоўскім аўтарам.

Калі адыходзіў са сьвяткаваньня ўгодкаў, у Пакроўскім саборы званілі званы. Дзьве бабулькі, што разам са мною апраналіся ў гардэробе, шпарка падаліся ў сабор. Ідучы за імі, чуў іх гаворку: вось наладзілі сьвята, лепей бы пайшлі у сабор ды заказалі імшу па нябожчыку, ды сьвечачку паставілі — было б па-людску.

І. СЕМЯНОЎСКІ.

● *Салігорск*

У ПАВЕТРЫ ЛУНАЕ СЛОВА «ЗАБАСТОЎКА»

Калі на сэсіі Вярхоўнага Савета Беларусі абмяркоўвалася пытаньне аб кампэнсацыі стратаў насельніцтва на ашчадных рахунках у выніку інфляцыі, адзін з дэпутатаў прапанаваў павялічыць сумы ўкладаў у 40 разоў — адпаведна росту заработнай платы. Ураду давялося адшукаць ажно трыльёны рублёў — у такую «капейчыну» ужо ўляцелі укладчыкам ягоныя «рэформы». Атрымліваецца, што кожны жыхар рэспублікі за нейкую пару гадоў за будучае шчасьлівае рынкавае жыцьцё заплаціў па 100 тысяч рублёў на цяперашнія грошы.

Адсюль незадаволенасьць адных людзей, безнадзейная роспач другіх, што калі-нікалі праяўляецца акцыямі пратэсту. Вось і ў вытворчым аб'яднаньні «Беларуськалій» зноў загучала слова «забастоўка»... Гутарку аб надзённых праблемах прапануем з намесьнікам старшыні Салігорскай рэгіянальнай арганізацыі Незалежнага прафсаюза гарнякоў Ю. А. Красоўскім.

— ЛЕТАСЬ шахцёры доўга змагаліся за падпісаньне з урадам тарыфнага пагадненьня. Нечага дамагліся, хаця й далёка не ўсяго. Сёлета, здаецца, гісторыя паўтараецца...

— Так, на бягучы год павінна быць заключана новае пагадненьне. З студзеня прадстаўнікі НПГБ выязджалі для пачатку перамоў па гэтаму пытаньню. Але нічога не атрымалася — камісія па нафце і хіміі ўпаўнаважана весьці перамовы толькі па праблемах, якія датычаць сваёй галіны. Наш прафсаюз цяпер аб'ядноўвае рабочых пяці галінаў прамысловасьці. Таму неабходна, каб і ва ўрадавую камісію ўваходзілі прадстаўнікі ад усіх. Перагаворы адкладзены.

— Якія найбольш прынцыповыя пункты гарняцкага праэкту Тарыфнага пагадненьня?

— Індэксацыя зарплаты ў залежнасьці ад інфляцыі, пэрсаніфікаванае сацыяльнае страхаваньне, выплата часткі заробку рабочым у валюце, абмежаваньне рабочага часу шахцёраў 7 гадзінамі, пачынаючы ад спуску ў шахту да пад'ёму на гару.

— У мінулым годзе 40-дзённая забастоўка дала шахцёрам грунтоўную прыбаўку да заробку. Што зрабіла з ім імклівая інфляцыя?

— Калі меркаваць па пакупной здольнасьці атрымоўваемых грошай — падзеньне ў некалькі разоў. Выйгралі ад забастоўкі, у першую чаргу, не звыш пяці тысяч шахцёраў, а ІТР і служачыя, якія нічым не рызыкавалі, спраўна хадзілі на працу. Напрыклад, начальнік горнага ўчастка мае цьвёрды аклад болей 30 тысяч, а тарыфная стаўка машыніста горнага камбайна шостага разраду — на трэць меншая. Апошняму, каб узьняцца да ўзроўню заробку свайго кіраўніка, трэба папрацаваць вунь як. А ён можа стварыць толькі выгляд работы замест таго, каб забясьпечыць неабходныя ўмовы. Ненармальна, што залежнасьць зарплаты рабочых ад вынікаў працы намнога большая, чым у кіраўнікоў. Зьмены да лепшага, лічу, не пачнуцца, пакуль ня будзе наадварот.

— Збыт прадукцыі за мяжу становіцца ўсё больш праблематычным, падаюць яе цэны на міжнародным рынку, а шахцёры дабіваюцца большай платы для сябе...

— Магчымым скарачэньнем вытворчасьці, а значыцца і кадраў, якраз і палохае адміністрацыя. Застрашаныя кіраваць лягчэй. Ды не ўсё так, як нас запэўніваюць. Мы спэцыяльна зрабілі запыт у інстытуты, якія займаюцца праблемай Усходне-эўрапейскіх краін. Дык вось, краіны, дзе не сьціхаюць вайсковыя канфлікты, купляюць калійных угнаеньняў некалькі меней. Але гэта кампэнсуюць Амэрыка і іншыя, з кім, нягледзячы на зьніжэньне коштаў, гандляваць усё роўна выгадна. А ў бліжэйшыя гады попыт на калій на міжнародным рынку павінен істотна падвысіцца.

— Моцна сумняваюся, што саступіць сёлета ўрад, які летась вытрымаў такі націск шахцёраў і ня падпісаў самых прынцыповых пунктаў Тарыфнага пагадненьня.

— Мінулай вясной гарнякі паказалі, што ўмеюць дамагацца сваіх мэтаў. Уліччыце зараз іх гарт і вопыт нашага прафсаюза — гэта ўжо іншыя людзі, якія пераканаліся, што іх сіла ў адзінстве. Да таго ж летась гарнякі ўступілі ў супрацьстаяньне з урадам адны. Цяпер КПГБ уключае ў сябе арганізацыі Навалукомльскіх энэргэтыкаў, бытавікоў Салігорска, шыньнікаў Бабруйска, вытворчых аб'яднаньняў «Азот» (Горадня), «Палімір» (Наваполацак) і іншыя. Калі ўрад прадоўжыць цяганіну з падпісаньнем Тарыфнага пагадненьня, якая пачалася два месяцы таму, і будзе надалей ігнараваць справядлівыя патрабаваньні рабочых і правы прафсаюзу, ён дачакаецца аднаго — справакуе рэспубліканскую забастоўку. Апрача таго, мы інфармуем аб абстаноўцы сваіх калегаў у Амэрыцы, Нямеччыне, Польшчы і іншых краінах. Іх кіраўніцтва, даведаўшыся, што дэмакратычныя зьмены на Беларусі практычна не адбываюцца, наўрад ці будзе падтрымліваць яе ўрад. Ці доўга такі ўрад пратрымаецца?

— Геграфія Незалежнага Прафсаюза па-сапраўднаму ўражвае. Але ці такая ж яго рэальная сіла!

— У «Беларуськаліі» ён налічвае каля 2,5 тысячы чалавек, а ў рэспубліцы — 5 тысяч. Што датычыць сілы, узгадайце мінулагоднюю забастоўку, калі нас было значна меней.

Гутарку запісаў В. МУРЫЛЕЎ.

ЗВАРОТ

АСАЦЫЯЦЫІ СУДДЗЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Кожны пражыты дзень зьяўляецца пацьверджаньнем таго, што правы грамадзян Рэспублікі ва ўсіх сфэрах жыцьця — палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай — становяцца ўсё меней і меней абароненымі.

Законы, якія прымаюцца Вярхоўным Саветам, заклікаюць па сваёй сутнасьці забясьпечыць абарону грамадзтва і кожнага грамадзяніна паасобку, як правіла, недасканалыя, дэкларатыўныя й не ствараюць неабходных прававых гарантый.

Урачыста абвясьціўшы 27 ліпеня 1990 года ў Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэтах Рэспублікі Беларусь, аб сваёй рашучасьці стварыць прававую дзяржаву, Вярхоўны Савет заявіў, што найважнейшым прынцыпам існаваньня гэтай дзяржавы зьяўляецца разьмежаваньне заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладаў, аднак практычна не прыняў ніякіх адпаведных захадаў для ўвасабленьня ў жыцьцё прынцыпаў, якія сам абвясьціў.

Судовая ўлада ня толькі ня стала незалежнай, а наадварот, рашэньне асноўных пытаньняў, якія датычаць арганізацыі й дзейнасьці судоў, усё ў значнай ступені залежыць ад волі выканаўчай улады.

Прававыя і матэрыяльныя асновы, якія забясьпечваюць нармальную дзейнасьць судоў і вызначаюць статус суддзяў, да цяперашняга часу не створаны. Прынятыя Вярхоўным Саветам канцэпцыі судова-прававой рэформы зьяўляюцца нічым іншым, як праграмай без гарантый.

Тым часам шэраг прынятых заканадаўчых актаў сьведчыць аб наданьні прыярытэтаў у праваахоўнай дзейнасьці адміністратыўным структурам улады.

Распрацаваны Саветам Міністраў праэкт Закона Рэспублікі Беларусь «Аб судаўтварэньні і статусе суддзяў у Рэспубліцы Беларусь», які быў прадстаўлены для разгляду ў Вярхоўны Савет, зьяўляецца пераканаўчым доказам імкненьня цалкам падпарадкаваць суды выканаўчай уладзе.

Усё гэта прывяло да таго, што з судовых устаноў адыходзяць кваліфікаваныя спэцыялісты, існуе шмат цяжкасьцяў з падборам кадраў, шмат якія пасады працяглы час застаюцца вакантнымі. У шэрагу выпадкаў суддзямі абіраюцца асобы, якія па сваіх маральных якасьцях не адпавядаюць гэтай высокай пасадзе. У цэлым зьніжаецца інтэлектуальны ўзровень судовага корпуса, трацiцца аўтарытэт суда, у сьвядомасьці грамадзян узьнікае недавер да існуючага закона.

Такія адносіны да суда і суддзяў як носьбіта судовай улады ня можа пакінуць абыякавым кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і грамадзтва ў цэлым. Гісторыя нашай дзяржавы мае дастаткова прыкладаў, калі суд выкарыстоўваўся іншымі структурамі ўлады як зброя для запалохваньня народа, а не як сімвал справядлівасьці й веры.

Права на непрадузяты і справядлівы суд па сваёй Канстытуцыі мае кожны грамадзянін Рэспублікі, і гэта права можа забясьпечыць толькі незалежны суд.

Асацыяцыя суддзяў Беларусі выказвае вялікую занепакоенасьць становішчам, якое склалася ў судовай сістэме Рэспублікі Беларусь, зьвяртаецца да ўсіх партый, грамадзкіх рухаў, грамадзян Рэспублікі, усіх, каму небыякава адраджэньне Беларусі як прававой дзяржавы, з просьбай аб'яднаць намаганьні ў рэалізаваньні прынцыпа падзелу ўладаў.

Суддзі Рэспублікі заяўляюць аб сваёй непрадузятасьці да ўсіх палітычных партыяў і грамадзкіх рухаў, спадзяючыся на іх падтрымку ў вырашэньні пытаньняў па ажыцьцяўленьню судовай рэформы і станаўленьня незалежнага суда.

г. Менск.

12 лютага 1993 г.

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ Ў ВІЛЬНІ

АДРАДЖЭНЬНЕ ТБШ

У СЯРЭДЗІНЕ студзеня ў Вільні адбыўся ўстаноўчы сход Таварыства Беларускай Школы, якое будзе аб´ядноўваць найперш настаўнікаў, вучняў і бацькоў беларускіх навучальных установаў у Летуве, а таксама тых, каму неабыякавая справа адраджэньня беларускага школьніцтва.

ТБШ існавала ў Вільні ў міжваенны час і было даволі масавай арганізацыяй. Галоўнай мэтаю адноўленае Таварыства ставіць адраджэньне славутай Віленскай беларускай гімназіі. А ў тых раёнах, дзе няма магчымасьці ствары́ць беларускую школу, сябры ТБШ будуць дапамагаць арганізоўваць гурткі і факультатывы.

Апрача гэтага, Таварыства будзе займацца вывучэньнем і захаваньнем беларускага фальклёру й багатага дыялектнага матэрыялу Віленшчыны, аднаўленьнем беларускіх народных рамёстваў, прапагандай беларускіх культурных традыцыяў.

На ўстаноўчым сходзе ТБШ прысутнічалі выкладчыкі ВНУ і настаўнікі з розных школаў Вільні, бацькі й студэнты. З вялікай цікавасьцю слухалі дэлегаты выступленьне настаўніцы першае ў пасьляваеннай Вільні беларускае клясы Галіны Сівалавай. За паўгода працы клясы можна гаварыць ужо й пра вартасьці праграмы, якую спэцыяльна стварыла Кафэдра беларусістыкі Віленскага пэдунівэрсітэту. Гэтая праграма значна адрозьніваецца ад звычайных праграмаў сярэдняй школы.

Гаварылі на сходзе і пра магчымасьці атрыманьня адукацыі ня толькі ў Летуве й на Беларусі, але і ў іншых краінах. Нарэшце, быў абмеркаваны й зацьверджаны Статут ТБШ, абраная Рада і Рэвізійная Камісія. Выбары прайшлі на альтэрнатыўных падставах. Вырашана 27 лютага правесьці вялікі сход ТБШ дзеля абмеркаваньня праграмы арганізацыі.

Ірэна ЛАВІК,
сакратар ТБШ.

Ужо другі год на факультэце славістыкі Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсітэту працуе беларускае аддзяленьне, якое рыхтуе настаўнікаў для будучых беларускіх школ у Летуве.

Адкрыцьцё Кафэдры беларусістыкі як цэнтра арганізацыі беларускіх навучальных установаў — зьява заканамерная, абумоўленая багатай віленскай гісторыяй, культурнымі й асьветніцкімі традыцыямі. Для беларусаў Віленшчына — зямля родная, унікальны рэгіён традыцыйнай нацыянальнай культуры, дзе захавалася яшчэ беларуская мова, аўтэнтычны фальклёр. Гэта ні ў якім выпадку не эмігранцкае асяроддзе.

Асьвета й адукацыя — вызначальнае зьвяно адраджэнскага руху, ядро фармаваньня нацыянальнай сьвядомасьці народа. Таму адраджэньне беларускага школьніцтва на Віленшчыне трэба разглядаць у кантэксьце ўсяго Беларускага Адраджэньня, усьведамляючы месца Вільні ў гісторыі Беларусі. Беларускія школы ў Віленскім краі існавалі й будзе справядлівасьцю іх аднаўленьне разам са славутай Віленскай беларускай гімназіяй.

Сёньняшняя палітычная сітуацыя зьяўляецца пакуль спрыяльнай для разьвіцьця беларускай адукацыі. Паступова расьце аўтарытэт Беларусі як эканамічнага партнёра й бліжэйшага суседа, з якім Летува стагоддзямі жыла ў адной дзяржаве. У хуткім часе будзе падпісана пагадненьне паміж Міністэрствамі адукацыі Беларусі й Летувы, што стане юрыдычным гарантам атрыманьня беларусамі адукацыі на роднай мове. Бо толькі сталая дзяржаўная падтрымка з боку Беларусі зможа зрабіць незваротным працэс адраджэньня беларускіх школаў у Летуве.

З верасьня мінулага года ў СШ № 13 Вільні пачала працаваць першая беларуская кляса. Настаўніца Г. Сівалава займаецца з дзецьмі па гімназічнай праграме, распрацаванай Кафэдрай беларусістыкі ВПУ. Пры складаньні гэтай праграмы былі ўлічаныя вопыт Гарадзенскай беларускай гімназіі й асаблівасьці Віленскага рэгіёну, найперш — шматмоўнасьць. Галоўную задачу беларускай школы мы бачым у выхаваньні тыповага віленчука, які валодае мінімум чатырма мовамі (беларускай, летувіскай, польскай, расейскай).

Віленская беларуская гімназія павінна быць, на нашу думку, клясічнай установай дадзенага тыпу, выкарыстаць лепшыя традыцыі папярэдніцы і адпавядаць усім сучасным патрабаваньням. Толькі тады яна зможа знайсьці сваіх прыхільнікаў, стаць прэстыжнай і канкурэнтаздольнай. Цяпер ствараецца навучальная праграма, аб´яўлены набор вучняў з першае па дванаццатую клясу **(даведкі па тэл. 35-58-01).**

БЕЛАРУСКІ УНІВЭРСІТЭТ

Выпускнікі беларускіх школ і гімназіі будуць мець магчымасьць на льготных умовах атрымаць наступную адукацыю на Беларусі. Ужо сёньня выпускнікі могуць быць накіраваны ад нашай Кафэдры пры пасярэдніцтве Міністэрства адукацыі Беларусі на вучобу ў беларускія ВНУ й сярэднія спэцыяльныя ўстановы. Ва ўнівэрсітэце працуюць курсы беларускай мовы для абітурыентаў, бо галоўная ўмова паступленьня да нас — валоданьне беларускай мовай.

Вышэйшую пэдагагічную адукацыю выпускнікі змогуць атрымаць у Летуве, паступіўшы на беларускае аддзяленьне ВПУ. Акрамя спэцыяльнасьці «беларуская мова й літаратура» студэнты маюць права выбраць яшчэ адну дадатковую спэцыяльнасьць з тых, па якіх ідзе падрыхтоўка на іншых факультэтах унівэрсітэту. Гэта дапаможа ў працаўладкаваньні выпускнікоў нашага аддзяленьня. Таксама яны змогуць працаваць у беларускіх праграмах радыё й тэлебачаньня, беларускім музэі, беларускіх газэтах і часопісах.

У аддзяленьня цесныя кантакты з рознымі ўстановамі на Беларусі. Мы шчыра ўдзячныя за дапамогу шматлікім бібліятэкам, асабліва Гарадзенскай вабласной і Віцебскага пэдінстытуту, кафэдры беларускай мовы Гомельскага унівэрсітэту і факультэту беларускай філалогіі й культуры Менскага пэдінстытуту ды многім іншым спрыяльнікам. Наперадзе — шмат плянаў і падзеяў. Галоўнае — з адкрыцьцём аддзяленьня зьявіліся маладыя сілы, якія здольныя зрабіць рэальнасьцю адраджэньне беларускага школьніцтва на Віленшчыне.

Лілея ПЛЫГАЎКА,
загадчык Кафэдры, старшыня ТБШ.

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ КЛЯСА

ГЭТАЯ кляса створаная летась у верасьні ў віленскай СШ № 13. Займаюцца тут дзевяць дзетак, але кляса папаўляецца новымі вучнямі. Працуе кляса па гімназічнай праграме. Сярод прадметаў і факультатываў — як асноўныя: родная мова, матэматыка, народная музычная творчасьць, выяўленчае мастацтва,— так і факультатыўныя: бальныя танцы, шахматы, летувіская і замежныя мовы.

На навагоднія вакацыі дзеці й бацькі наведалі Менск. Уражаньняў засталося шмат: пабывалі ў Траецкім прадмесьці, паглядзелі цудоўныя выставы цацак і вырабаў народных майстроў, набылі сьвістулькі й гліняныя цацкі. Змаглі паглядзець навагодні паказ у цырку, схадзілі ў краязнаўчы музэй. За тое, што дзень атрымаўся насычаны й багаты на ўражаньні ды падзеі, трэба дзякаваць супрацоўнікам беларускага гуманітарнага ліцэю, які ня толькі апякуецца беларускай клясай, але й шмат дапамагае беларускаму аддзяленьню Віленскага пэдагагічнага унівэрсітэту.

Вядома, ня толькі з экскурсій складаецца наша пазакляснае жыцьцё. Былі цікавыя сустрэчы з нашымі віленчукамі, калядны ранішнік у школе, удзел у навагодняй ёлцы для віленскіх беларускіх дзетак... А цяпер мы рыхтуемся да Гуканьня вясны й сьвята «Вясёлкі» — сустрэчы з супрацоўнікамі часопіса.

Запрашаем заходзіць да нас: **Вільня, вул. Еваро 6, дзіцячы сад № 38, першая кляса. Тэл. 63-29-29.**

Галіна СІВАЛАВА,
настаўніца, намесьнік старшыні ТБШ.

РАДА ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

ПЛЫГАЎКА Лілея Леанідаўна — старшыня, тэл. 35-58-01 (прац.).

СІВАЛАВА Галіна Канстаньцінаўна — намесьнік старшыні, тэл. 63-29-29 (прац.).

КАДАЧ Тамара Антонаўна, тэл. 35-37-46 (х).

ПЯТКЕВІЧ Гендрык Станіслававіч, тэл. 35-58-01 (прац.).

САЎЧАНКА Павел Пятровіч, тэл. 61-62-24 (х).

СТАНКЕВІЧ Язэп Язэпавіч, тэл. 22-90-95 (х).

ШАВЫРАВА Крыстына Мікалаеўна, тэл. 63-08-20 (х).

Рэвізійная камісія

ВАШЧАНКА Віктар Сяргеевіч, тэл. 23-46-89 (х), 44-65-38 (прац.).

КІРПЛЮК Ванда Валяньцінаўна, тэл. 66-70-42 (прац.).

ХАМЯНЮК Вера Васільеўна, тэл. 42-56-41.

БЕЛАРУСКАЯ ГІМНАЗІЯ

Вучыцеся,
браты мае,
Думайце, чытайце,
І чужому
навучайцеся,
Але й свайго
ні цурайцеся...
Т. ШАЎЧЭНКА.

У АРТЫКУЛЕ «Родная мова й яе значэньне» Язэпа Лёсіка неаднаразова падкрэсьліваецца, што толькі асьвета на роднай мове вывядзе беларускі народ на шлях «сьветлага разумнага жыцьця». Беларуская гімназія, заснаваная ў Вільні ў 1919 г., якраз і была такой асьветніцкай установай, якая давала веды на роднай мове.

Ідэя заснаваньня ў Вільні беларускай сярэдняй школы зарадзілася ў аднаго з піянераў беларускага адраджэньня — Івана Луцкевіча. Адкрыцьцё гімназіі адпавядала даўно насьпеўшай патрэбе беларускага народу мець у Вільні як у гістарычным цэнтры беларускай культуры сваю сярэднюю школу. Акрамя Івана Луцкевіча ініцыятарамі заснаваньня гімназіі былі М. Кахановіч — першы дырэктар гімназіі — і другія сябры «Камітэту помачы пацярпеўшым ад вайны». Адкрыцьця гімназіі камітэт дабіваўся з часу нямецкай акупацыі. Пасьля адыходу немцаў з Вільні ўладу ўзяла ў свае рукі Летувіская Тарыба. Ад яе Іван Луцкевіч атрымаў пацьверджаньне дазволу адкрыць гімназію. Афіцыйнае адчыненьне гімназіі было абвешчана папераю міністра Летувіскай Тарыбы ад 4.01.1919 г. , на падставе гэтае паперы Беларускаму камітэту помачы пацярпеўшым ад вайны дазвалялася з 1 студзеня 1919 г. адчыніць у Базыльянскіх Мурах васьмікласавую гімназію зьмешанага тыпу.

Між тым, 6-га студзеня 1919 г. у Вільню ўвайшла Чырвоная Армія, а 20-га лютага была аб´яўлена Летувіская Савецкая Рэспублік . Ад ураду гэтай рэспублікі таксама быў атрыманы дазвол на беларускую гімназію.

Прызначаныя на гімназію Базыльянскія Муры былі вельмі занядбанымі. Школьны інвэнтар быў больш чым сьціплы. Вялікую дапамогу ў аднаўленьні памяшканьня аказаў бацькоўскі камітэт, і першага лютага ў гімназіі пачаліся заняткі.

Вось як піша аб гэтых падзеях М. Кахановіч: «... Мне хацелася б успомніць, каб не забылася, гэта праца Івана Іванавіча (Луцкевіча) па стварэньню ў Вільні беларускай гімназіі. Вельмі хворы, ён, на вялікую шкоду свайму здароўю, многа працаваў над тым, каб адчыніць у Вільні беларускую гімназію... Сам узяўся выкладаць беларусазнаўства і краязнаўства».

Пасьля акупацыі Віленшчыны і ўсёй Заходняй Беларусі польскімі ўладамі гімназія існавала і надалей, а скончыла сваё існаваньне ажно ў 1944 г. На працягу дваццаці пяці гадоў сваёй дзейнасьці яна кавала кадры сьвядомай беларускай інтэлігенцыі і гэтым самым унесла вялікі даробак у нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі.

Цяпер у Вільні распачата праца па адраджэньню беларускай гімназіі. Выкладаньне ў гімназіі будзе весьціся на беларускай і літоўскай мовах, паралельна з узмоцненым вывучэньнем замежных моў і іншых моў Віленшчыны (расейскай і польскай). Мяркуецца даць трывалыя веды па сусьветнай культуры, практычныя навыкі народных рамёстваў. Сярод гімназічных прадметаў і факультатываў будуць выкладацца бальныя танцы, шахматы, этыкет і інш. Галоўная мэта гімназіі — выхаваньне чалавека эўрапэйскай культуры.

Хацелася б, каб гімназія была для сваіх выхаванцаў сапраўднай «альма матэр», каб у ёй была створана атмасфэра цеплыні і ўзаемапавагі, каб былі спрыяльныя ўмовы для самараскрыцьця асобы.

Гендрык ПЯТКЕВІЧ,
арганізатар-дырэктар Віленскай беларускай гімназіі.

ВАЛЮТНЫ КУРС

Вільня

(адносна летувіскага талёна)

	Скупка	Продаж
амэрыканскі даляр	430	447
нямецкая марка	260	266
расейскі рубель	0,060	0,75

ЦЭНЫ НА ВІЛЕНСКІМ РЫНКУ У МІНУЛЫЯ ВЫХАДНЫЯ

Ялавічына, 1 кг — 280—300 тал.

Масла, 1 кг — 380—400 тал.

Тварог, 1 кг — 140 тал.

Яйкі, 10 штук — 150 тал.

Квашаная капуста, 1 кг — 100 тал.

Перадаў па тэлефоне С. СУБАЧ.

ЛЕТУВА — НАРВЕГІЯ

ТРАНСПАРТНІКІ Летувы і Нарвегіі падпісалі дамоўленасьць аб узаемных бязмытных перавозках аўтатранспартам. Плануецца адкрыць паромную лінію з Летувы ў Швецыю, што пашырыць узаемныя сувязі з краінамі Скандынавіі.

Таксама мяркуецца атрымліваць з Нарвегіі нафту, ствараць сумесныя вытворчасьці. Нарвежцы дапамогуць арганізаваць тэхнічны нагляд за флотам, весьці пошук карысных выкапняў.

КОЛЬКІ КАШТУЕ ЦАР БЕЛАВЕЖЫ ...

ЛЕТАСЬ польскі нацыянальны парк «Белавежа» прадаў за мяжу сямнаццаць зуброў,— па кошту ад адной да пяці тысяч даляраў за кожнага пушчанскага волата. Сродкі гэтыя пайшлі на патрэбы нацыянальнага парку.

Вось і цяпер прыйшлі запыты з Чэхіі, Францыі, Нямеччыны, ці не прадасьце нам зуброў?

М. ДУБРАВІН.

Фатаграфаваў А. МАКАРЭВІЧ.

РОЗНАЕ БЛАГОЕ ЖЫЦЬЦЁ

на Беларусі і ў Летуве

Нядаўна прыязджаў я з Вільні ў Горадню, усякае чуў, усякае людзі гавораць. Кажуць, напрыклад, што ў нас у Летуве зусім блага жыць стала, што Летува ўжо не патрэбная нікому. Маўляў, ні сыравіны, ні разьвітае эканомікі там няма, ні надта выгоднага геграфічнага становішча. Словам, нікому ў сьвеце такая маленькая краінка ня трэба... Гэткімі словамі жыхар Беларусі выказвае сваю пагарду й паблажлівасьць да суседняе натурыстае рэспублікі, якая ўчора яшчэ была побач, каля нас, у нашым «калгасе», ды гэтак жа, як і мы, ня рыпалася, а тут, бачыш, захацела жыць асобным жыцьцём, ірванулася да незалежнасьці, да капіталізму, на Захад... І што! Анічога! Жывуць яшчэ горш за нас, якія нікуды ня рваліся і калгасы не развальвалі. Вады гарачай ня маюць! Галодная, выходзіць, іхняя свабода, і халодная...

ВЯДОМА, ёсьць ва ўсім гэтым праўда, але, мусіць, ня ўся. Такія развагі жыхара Беларусі ўзятыя з менскіх ды маскоўскіх сродкаў масавай інфармацыі, якія, калі разабрацца, не на Летуву бочкі коцяць у сваіх «аднабокіх» рэпартаж з Вільні, а на рэчы зусім іншага парадку: свабоду, незалежнасьць, прыватызацыю. Каб беларускага чалавека гэтыя рэчы не спакушалі — хай глядзіць і чытае, як тая свабода абарочваецца для Летувы. Або толькі яму ў сябе нічога зьмяняць не захацелася.

Як жа выглядае другі бок гэтае праўды?

Сапраўды, жыцьцё ў нас ня лепшае, чымся ў Рэспубліцы Беларусі. У нечым горшае (тую ж ваду гарачую даюць рэдка), а ў нечым крыху лацьвейшае (напрыклад, кошты ў камэрцыйным гандлі ў нас ніжэйшыя — на цыгарэты, гарбату, каву і г. д.). Увогуле жыцьцё таксама кепскае. Але рэч у тым, што гэта ўсё ж **іншае** кепскае жыцьцё.

Летува нікому не патрэбная? Так. Але ў Летуве цяпер пра гэта думаюць толькі палітыкі й журналісты. Народ гэта мала хвалюе. Бо народ заняты. Ён прыладкоўваецца, будуецца, абжываецца. Кожны шукае нейкую сваю пэрспэктыву. Ніхто не мітынгуе, не галадуе, не страйкуе, хоць розных партыяў ды страйкамаў у Летуве багата. Чалавек заняты сваім жыцьцём, тымі магчымасьцямі, якія дала яму дзяржава. Хай сабе й невялікія гэта магчымасьці. І першая з іх — прыватызацыя, тая самая, з якой у Рэспубліцы Беларусі старшыні калгасаў ды афіцыёзныя газэты зрабілі пудзіла. Між тым, прыватызацыя — гэта зусім не п 'яны спэкулянт. У Летуве ўжо другі год грамадзяне рэалізуюць свае інвэстыцыйныя чэкі. Больш абароцістыя купляюць заводы й буйныя крамы. (Напрыклад, у маім раёне выкупілі адзін з трох буйных гастраномаў. І нічога — працуе. Прадукты сьвежыя, кошты тыя ж. Толькі калі ў дзяржаўнай краме ў рабочы час усе прадаўшчыцы зьбіваюцца ў куточак глядзець «Марыяну» і да мяне ім справы няма, дык у прыватнай — калі ў нейкім аддзеле ўтвараецца чарга — туды адразу пераходзяць вольныя работніцы з іншых аддзелаў...)

Сяляне гэтай зімою зьбіраюць у архівах паперы на зямельныя дзялкі сваіх дзядоў ды прадзедаў. Іншыя зямлю купляюць за інвэстыцыі. Гарадзяне за тыя чэкі (па сёньняшніх грашах — за бясцэнак) выкупілі свае кватэры й адчулі за сьпіною надзейны капітал — нерухомасьць, якая ўжо цяпер каштуе ад сямі да дваццаці тысяч даляраў. Людзі шукаюць лепшае ці самі ствараюць сабе рабочыя мейсцы. Людзі паверылі, што ніхто ў іх нічога не адбярэ. Словам, круціся, рупся, хто дбае — той мае. «За так» дзяржава цяпер дасьць толькі старым і нямоглым. Самае галоўнае — чалавек не чакае беспрасьветнай будучыні, якую яму прынясе нехта іншы — дзяржаўны чыноўнік ці старшыня калгасу. А на Беларусі той старшыня цяпер усяляк тармозіць прыватызацыю зямлі, пакуль не набраўся сам, каб заўтра, калі ў калгасе застануцца толькі дзіравыя пакрышкі, «дазволіць» прыватызацыю сялянам. І яны зноў прыйдуць да яго на працу, толькі ўжо не як да старшыні, а як да пана. І гэтак жа будуць бараніць свайго пана, як цяпер бароняць калгасы...

Вось чаму на Беларусі і ў Летуве кепскае жыцьцё рознае, у Летуве праз цяжкасьці пераходнага часу фармуецца сярэдняя кляса — большасьць забясьпечаных людзей пры меншасьці жабракоў і міліянераў. А на Беларусі, якая таксама ў пераходным часе, адбываецца ўсё больш рэзкі падзел на жменьку багацеяў і вялізную масу галоты. Будучыня закладаецца ўжо сёньня і заўтра можа абярнуцца зусім нечакана.

Пройдзе болей ці меней гадоў пяць, і ў Вільні дадуць гарачую ваду настала. Але гэта ўжо будзе гарачая вада ў нармальнай эўрапэйскай дзяржаве. Магчыма, у той самы год на Беларусі гарачую ваду толькі адключаць. Ці таму што РБ таксама рашуча возьмецца за справу свае незалежнасьці, ці таму што яшчэ бліжэй прысмокчацца да Расеі, дзе працэс распаду апошняе ў сьвеце імпэрыі толькі пачаўся, і «лепшая старэйшая сястра» Беларусі можа хутка застацца без сваіх Татарстанаў, Якуціяў ды іншых сыравінавых калёній, на якія так спадзяюцца ў Менску. А то яшчэ й прынясе да нас сваю грамадзянскую вайну.

Вось я й думаю — хай пакуль жыцьцё будзе горшае, абы рэальнай была надзея.

Беларус-віленчук.

«МЫ МОЖАМ СТАЦЬ КВІТНЕЮЧАЙ ПРАВІНЦЫЯЙ»

Уласны карэспандэнт газэты «Пагоня» сустрэўся з галоўным рэдактарам часопіса міжнароднага супрацоўніцтва «ДЕЛО (Восток+Запад)» — вядомым у нас і за межамі Беларусі журналістам (дастаткова ўзгадаць вострыя матэрыялы ў часопісе «Огонёк» пра Курапаты, інтэрв 'ю з Алесем Адамовічам на Чарнобыльскую тэму), аўтарам кнігі публіцыстыцы «Наўсцяж па Нямізе» Віктарам Жуком.

— СП. Віктар, зараз пачаў імкліва расьці курс даляра. У чым, на вашую думку, карані гэтага працэсу? Няўжо навучыліся так лоўка спэкуляваць валютай? Такім чынам можна літаральна разваліць эканоміку.

— Я ведаю, што існуе такая думка, быццам гэта ўсё — біржавыя спэкуляцыі. Але ня ў тым справа. Курс даляра пачаў расьці з-за таго, што Расея выпусьціла ў абарот свае ўласныя грошы, адбыўся яшчэ адзін віток інфляцыі. Ці чакаецца чарговая стабілізацыя курса і на якой адзнацы? Не, ніякай стабілізацыі ня будзе. Усё з-за таго, што курс даляра ў нашай краіне, нават па адзнаках замежных спэцыялістаў, зусім не адпавядае сапраўднаму, а выстаўляецца ў адпаведнасьці з коштам нейкай пэўнай групы тавараў. Сапраўдны курс у розных крыніцах падаецца ад 30 да 100 рублёў. Я больш схіляюся да другой лічбы. Сэнс у тым, што ў нас ёсьць той тавар, які можа рэальна забясьпечыць нашыя грошы — гэта зямля.

— Але, наколькі я ведаю, урад яе прадаваць не зьбіраецца.

— Так, а таму гаварыць пра росквіт у нашай краіне ў бліжэйшы час не прыходзіцца. Я нядаўна быў на гэтак званым Нямецка-Беларускім эканамічным дне ў Боне, з 'арганізаваным прадстаўнікамі дзелавых колаў Нямеччыны й Беларусі з мэтай аналіза магчымасьцяў інвеставаньня немцамі нашай эканомікі. Нельга сказаць, каб вынікі сустрэчы абнадзейвалі. Экспэртамі нелькіх нямецкіх дасьледчых інстытутаў быў праведзены ўсебаковы аналіз нашага эканамічнага становішча з мэтай высьвятліць магчымасьці ўдзелу нямецкага бізнесу на Беларусі. Выснова адназначная — укладаць інвестыцыі ў нашую эканоміку ня варта.

— На чым заснаваныя такія меркаваньні?

— Галоўнае — у адсутнасьці гарантыяў захаваньня сваіх укладаў. А яны магчымыя толькі ў адным выпадку — калі заходнія бізнэсмены здолеюць набываць у нас зямлю. Паўстае пытаньне — як будзе жыць людзям на гэтае зямлі? Але ж багатыя людзі — праграматычныя, ім няма сэнсу набываць зямлю, каб потым нічога на ёй не рабіць. Гэта ж не выпадак з Ангельшчынай, калі адтуль па цагліне вывозіліся ў ЗША радавыя замкі. Нам гэта не пагражае. Але ніякая самая доўгатэрміновая арэнда ня здолее замяніць прыватнай уласнасьці. Уявіце сабе, што нехта пабудуе на дзяржаўнай зямлі свой уласны завод, альбо пераўсталюе стары. А потым яму скажуць: «Забірай свой завод, бо нам трэба ўчастак зямлі». І што тады рабіць? Вывозіць куды-небуддзь станкі? Каму гэта трэба? А самі без дапамогі з Захаду мы ня здолеем узьняць сваю эканоміку, а таксама й дабрабыт, на сусьветны ўзровень.

— А можа, прычына ў іншым? Можа, наш народ настолькі прызвычаіўся да таго, што сталіца дзесьці ў Маскве, што гэтая правінцыйная сьвядомасьць не дазваляе яму зразумець сваю адметнасьць, сваю раўнацэннасьць у шэрагу іншых краін і народаў?

— Не магу пагадзіцца. Так ужо гістарычна склалася, што існуюць два сусветных цэнтры эканомікі — адзін у Маскве, другі, на маю думку, у Нямеччыне. Зразумела, што ўсё гэта вельмі ўмоўна. Але хочам мы таго, альбо не, мы — эканамічная правінцыя. А таму нам нельга адасабляцца, ірваць наладжаныя сувязі. Толькі разам, у эканамічным саюзе з іншымі краінамі былога СССР, мы зможам выйсьці з крызісу, стабілізаваць эканоміку й узьняць дабрабыт. Так, мы — правінцыя. Але мы можам быць квітнеючай правінцыяй.

— Што тут можна сказаць? Калі ўзяць за аснову схэму, прапанаваную сп. Жуком, Беларусь зноў-такі знаходзіцца на самым водападзеле паміж двума сусьветнымі эканамічнымі сістэмамі. Перад намі зноў паўстае пытаньне: у якую з іх уліваецца, пайсьці на Захад, альбо на Ўсход? Але... Пасьля менскае сустрэчы кіраўнікоў дзяржавы СНД друк паведаміў, што напалоханыя аднаўленьнем трывалых эканамічных сувязяў былога СССР краіны Захаду пасьпяшаліся прыняць у Эўрапэйскую эканамічную супольнасьць Венгрыю, Чэхію й Польшчу, як найбольш разьвітыя эканамічныя краіны былога сац. лягеру. Было выказана шкадаваньне, што Беларусь не пайшла ў Эўропу, бо нібыта пры невялікай дапрацоўцы нашыя харчовыя прадукты, а таксама тавары лёгкай прамысловасьці маглі б быць цалкам канкурэнтназдольнымі на эўрапэйскім рынку.

Канешне, вылазіць з прорвы з дапамогай разьвітога Захаду было б больш цікава. Застаецца толькі спытацца ў іх: «А чаго ж вы чакалі?» і ў сябе: «А чаго чакалі мы?».

● *Пінск*

У ПОШУКАХ ЛЕПШАЙ ДОЛІ

33 пінчукі ад 'ехалі ў мінулым годзе на сталае жыхарства да Ізраіля — гэта на 8 чалавек меней, чым у 1991 годзе. Але казаць пра зьніжэньне патоку эмігрантаў з раённага цэнтру да «зямлі абяцанай» пакуль што рана. Праўда, у Пінску ёсьць і свае рээмігранты — два чалавекі летась вярнуліся на палескую Радзіму.

СКАРАЧАЮЦЬ ГРУЗАВЫ ФЛОТ

Толькі 33 буксіры з 48 існуючых у Пінскім рачным порце будуць працаваць сёлетняй навігацыйнай вясной. Астатнія з-за скарачэньня аб 'ёма перавозак будуць адведзены ў док. На жаль, пакуль што невядома, дзе будуць задзейнічаны экіпажы лішніх буксіраў.

У ГОНАР ЮБІЛЕЯ

Да 900-годдзя цэнтра палескага краю горада Пінска па замове пінчукоў нямецкая фірма «Эўрасьці» выпусьціць на 5 мільёнаў рублёў паштовак, буклетаў, календароў з відамі гісторыка-архітэктурных помнікаў горада, якія потым будуць рэалізаваны праз саюздрук Беларусі.

ІДЗЕ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

На Дняпроўска-Бугскім прадпрыемстве водных шляхоў пачалася рэканструкцыя шлюзаў. На месцы драўляных канструкцый будуць устаноўлены больш сучасныя мэталічныя камеры. У пэрспектыве па ўсёй сістэме Дняпроўска-Бугскіх каналаў драўлянае абсталяваньне будзе заменена на новае, што істотна павялічыць інтэнсіўнасьць руху цеплаходаў і станоўча адаб 'ецца на ўзроўні вады.

В. ЦЕЛЯЦІЦКІ.

Алесь ЧОБАТ

З цыкла «НОВАЯ ГАЛІЛЕЯ»

СПРАВАЗДАЧА ПРА ПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА

Месца Гароднi застаецца вялікай сцэнай тэатра абсурду.
Медны Ленін блішчыць — як вылізаны.
Споўніўся польскі праклён пары міжваеннай:
«Каб цябе немцы акупавалі,
а саветы вызвалілі!».
У вызваленай Гародні свабодны гандаль ідзе.
Процьма свадобных заняткаў!
Саветы — без камуністаў?!
Кожны грабе, як можа — але ніхто не крадзе.
Такіх наіўных паслалі на перабудову ў Барысаў.
Паэты і падпалкоўнікі — разам за Беларусь.
Дацэнты і прадпрыймальнікі — таксама за рэфэрэндум.
Тутэйшы сэпаратызм выцягвае шыю, як гусь.
Гэта Менск непакоіць.
Але нам таго Менску ня трэба.
Ад Менску — адны падаткі.
А што ён можа яшчэ?!
Лысыя ці смаркатыя — усё яны там такія.
А тут — квітнее, хто хоча!
За мяжу нават Нёман цячэ!
Адны толькі незадаволеныя — адстаўнікі пскаўскія...

ПАРЭЧЧА

Апошні апорны пункт
на мяжы зь Летувой.
Далей — адны толькі дачы,
начальства па градах паўзе.
Цягнікі. Грыбнікі.
Лес аж трасе галавой.
Лісічкі па два даляры.
Польшча ўсё завязе.
Экспансія. Дробны касьцёлік
абвешчаны рэпрадуктарамі.
Палянізуюць адчайна
наіўныя два ксяндзы.
На імшы адны цёткі старыя.
А Парэчча ўсё за прадуктамі
паехала да Друскенікаў—
як быццам няма мяжы.
Вакзалік часоў паўстаньня.
Ленін з адбітым носам.
Статак кабетаў чарнобыльскіх
праз санаторый нясе.
Ваякі свае, тутэйшыя.
Жыцьцё — як савецкая проза.
Лебядзі просяць булкі.
Сабака костку грызе.
«Былі мы тут усялякімі—
пабудзем і сувэрэннымі!»—
прыблізна так на палітыку
глядзяць і плююць мужыкі.
А восень ветрыкам з дожджыкам
сыпавае ўсё над Парэччамі.
А лясы навокал вялікія.
А ў лясах адны грыбнікі.

ПАСТАРАЛЬКА

Край без імя, прозьвішча і году нараджэньня
спрабуе паўстаць з магілы, робіць посьпехі—
ужо стаіць на каленях!
Будуць новыя пашпарты — як у Эўропе:
толькі імя і прозьвішча,
без дыскрымінацыі!
Але паўстае праблема: як пісаць?!
Шушкевіч Станіслаў Станіслававіч,
альбо—
Шушкевіч Станіслаў,
сын Станіслава?
Каб не насьлядаваць імпэрскую Расею...
Да таго ж — палякі пратэстуюць,
што іх пазбаўляць польскасьці,
касуючы пятую графу.
Край разьдзіраюць
дзьве праблемы нацыянальнага адраджэньня—
бэнзін і цукар.
Праблемы самога адраджэньня вырашаная—
мова стала дзяржаўнай.
А якая дзяржава — такая і мова...
Беларускія батальёны рыхтуюцца да бітвы
за ўраджай на палёх братняга Казахстану—
аплата па дамоўленасьці.
«...з нашым войскам незале-ежным
да сваёй зямлі адзінай...»
Ні кропкі дажджу.
Зьбялелая трава на лугох і пустках
Новае Галілеі.

ФОРМУЛА

Ня крыж злучае. Дзеляць не паны.
Край гэты ад вайны і да вайны
цярплівы, ціхі, сьціплы, працавіты.
І хто б калі даставў такой бяды,
каб часта не заходзілі сюды
палякі, немцы, швэды, маскавіты?!
І хіба так бы рэзаў брата брат,
каб не даваў чужак такі загад?!
Наш люд цярплівы, ціхі,
працавіты...
Але чаму паўсюдна цэлы час
ад рогату ажно здыхаюць з нас
палякі, немцы, швэды, маскавіты?!

ЧОРНАЯ ПАЛЬ

У чалавека і Бога
адна чырвоная кроў—
і не баіцца Бога
прагны сын чалавечы.
Гінуць зямля і неба.
Прыходзіць час змагароў,
якія вечна калечаць
няшчасны край гэты вечны.
Між чалавекам і Богам
стаяць касьцёл і царква—
і за падачкі грызуцца
дзеці гэтага краю.
Між чалавекам і Богам
трымае войска Масква—
ня сьпіць, ахоўвае межы,
трасецца, абараняе...
На чалавека й Бога
здрада, сьвінец і сталь
даўно ўжо прыгатаваныя—
на сэрца, душу й шыю.
У чалавека й Бога—
лясная чорная паль,
і тут яны сустракаюцца,
на мёртвай зямлі жывыя...

ВЁСКА

Па вёсках цягнецца
новы страх перад месцам:
што там яшчэ прыдумалі
змагары за Айчыну?
Палітыкам і журналістам
у краі мужыцкім цесна.
Вёсцы ня трэба пракорак.
Духу, Айцу і Сыну
верыць так, як па звычцы
ад прадзедаў засталося.
А розныя словаблуды
яе абыходзілі міла.
Хаты маўчаць, як у сьпёку
маўчыць ў полі калосьсе.
Зьлева — Рэч паспалітая.
Справа — Трэйцяга Рыма
ракетныя базы, танкі,
падпалкоўнікаў жонкі.
У вёсцы свая рэспубліка.
Гэтак было, як будзе.
Сеюць, косяць і гоняць—
ці ліпкі сьпякотны ліпень,
ці люты ў адліжным брудзе.
Вёска ня любіць места—
там дзяцей яе крыўдзяць.
Места вёску ня любіць—
там стаяць за калгасы.
Рэспубліка Беларусь
толькі кажа, што прыйдзе.
А жыцьцё прыходзіцца сёньня—
і часу няма на лясы.
Тыя ж, хто любяць народ,
кожнае лета на дачу
едуць і хваляць, і просяць
любога, каго сустрэнуць
даць ім літар, закуску,
на долю крыўдзяцца нашу,
і ведаюць, што ні спытаюць,
і зноўку да места едуць...
Сьпёка стаіць над абшарамі
краю сярод Эўропы.
Нехта ў вопратцы белай
па жыцьці йдзе, як па небу.
Пыл ляціць над зямлёю.
На лузе конь сівалобы
галавою страсае,
прыслухоўваецца да лета.

— Спорт — Спорт — Спорт — Спорт — Спорт —

ЦЯЖКІЯ ПЕРАМОГІ

ВЕЛЬМІ цяжка даюцца перамогі беларускім хакейным клубам «Нёман» з Гародні і «Хіміку» з Наваполацку на другім этапе адкрытага чэмпіянату Расеі. Нашы каманды прайграюць фактычна кожную другую гульню і таму, як вынік, знаходзяцца ў ніжняй частцы турнірнай табліцы Заходняй зоны.

Што ж перашкаджае беларускім хакеістам гуляць больш вынікова? Можа, супернікі вельмі моцныя? А можа, суддзі да іх стаўяцца вельмі патрабавальна? Тыя, хто стала назірае за гульнёй нашых каманд у Расейскім першынстве, ведаюць, што такі аргумэнт небезпадстаўны, але лічыць яго асноўным было б памылкова. На жаль, у апошнія сезоны беларускі хакей перажывае глыбокі крызіс. Асабліва гэта адчуваецца з таго моманту, як наша фэдэрацыя стала незалежнай. Яна ніяк не набярэцца моцы, каб адрэгуляваць некаторыя падводныя плыні ў дзяржаўным хакеі. Па-першае, фэдэрацыя моўчкі назірае пераходы хакеістаў з аднаго клюба ў другі. Дзякуючы гэтаму, цэлы шэраг гульцоў доўгі час быў па-за гульнёй. З-за фінансавых спрэчак паміж кіраўніцтвам гэтых клюбаў. Падругое, ў рэспубліцы існуе вострая праблема трэнерскіх кадраў. Сёлета яна дасягнула свайго эпагея. Аматары ведаюць, што фактычна ўсю другую палову розыгрышу гарадзенскі «Нёман» выступае ўсяго з адным трэнерам. Ня лепш выглядаюць і астатнія нашы прафэсійныя каманды.

Шмат непаразуменьняў узьнікае паміж адміністрацыяй каманд-майстроў і ДЮСШ. У сувязі з прызывам юных хакеістаў пад сьцягі дарослага хакею, клюбы спрабуюць атрымаць маладога хакеіста дарэмна, а спартшколы патрабуюць аплаты.

Дарэчы, за кожнага свайго выхаванца ДЮСШ просяць кругленькую суму грошай, што не заўжды па кішэні нашым вядучым клюбам. Вось тут бы і адрэгуляваць спэцыяльным тэстам, колькі каштуе майстэрства маладога хакеіста. Але функцыянеры ад хакею не сьпяшаюцца гэта рабіць ці проста ня ведаюць, як гэта робіцца. А пакуль вярхі вызначаюцца, беларускі хакей дакаціўся да самай нізкай адзнакі сваёй папулярнасьці.

Г. САДОЎСКІ.

РАЗЬВІТАНЬНЕ З РАПІРАЙ

У ПАРЫЖЫ прайшоў турнір рапірыстаў, прысьвечаны француза-расейскаму ювэліру Фабэржэ. Як ні сумна, але гэтыя спаборніцтвы сталі апошнімі ў спартыўнай біяграфіі пяціразовага чэмпіёна сьвету менскага рапірыста А. Раманькова. Пасьля выступу на турніры Аляксандр зрабіў заяву, што жадае працягваць сваю кар 'еру ў якасьці трэнера. На жаль, пакуль невядома, ці застанецца наш слаўны зямляк на Радзіме. З боку нацыянальных фэдэрацый фэхтаваньня розных краін у адрас Раманькова прыйшло шмат вельмі выгодных запрашэньняў на працу.

ДЭБЮТ НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СЬВЕТУ

ДНЯМІ ў прыгарадным курорце Сафіі Борыец закончыўся чэмпіянат сьвету па біятлону. Упершыню нашы страляючыя лыжнікі выступілі на гэтых прэстыжных спаборніцтвах асобнай камандай. На жаль, не змагла паказаць свае лепшыя якасьці мужчынская зборня. Яна дасягнула сьціплага пятага месца ў эстафетнай гонцы на сем з паловай кіламэтраў. Затое парадавалі беларускіх аматараў біятлону нашы дзяўчаты. Яны выйгралі срэбраныя ўзнагароды ў камандный гонцы, а іх лідэр Сьвятлана Парамыгіна дабілася бронзы ў асабістай гонцы на 15 кіламэтраў.

Г. А.

ПАЧАЛІ З ПЕРАМОГІ

Перамогай адзначылі свой дэбют на чэмпіянаце Эўропы валейбалісткі зборні Беларусі. У сваёй першай гульні яны адужалі сваіх сапернiц па падгрупе валейбалістак Партугаліі з лікам 3:1. Ход паядынка па партыях 15:3, 17:15, 6:15, 15:9. Наступны сапернік нашых дзяўчат — зборня Турцыі. З ёй валейбалісткі Беларусі згуляюць 25 красавіка ў Стамбуле.

«РАПІД» НА ЛАПАТКАХ

Выдатна правялі першую чвэрцьфінальную гульню кубка ІГФ гандбалісткі менскага «Палітэхніка». Яны з лікам 28:21 перамаглі бухарэскі «Рапід». Гэтым самым зрабілі сабе неблагі запас мячоў перад гульнёй ў адказ, якая адбудзецца праз тыдзень ў Бухарэсьце.

Г. СМОЛЬСКІ.

● *Крымінальная хроніка*

СУМНЫ ТЫДЗЕНЬ...

У крымінальных адносінах мінулы тыдзень зноў быў неспакойны. Усяго па Гарадзенскай вобласьці зарэгістравана 44 злачынствы. Найболей крадзяжоў: асабістай маёмасьці — 35 выпадкаў, дзяржаўнай — 31. Зарэгістравана шэсьць рабаўніцтваў, 15 цялесных пашкоджаньняў, адно згвалтаваньне, іншых злачынстваў — пяць.

Па-ранейшаму сумная зводка, сумныя думкі і небясьпека для сябе і блізкіх...

М. МІКАЛАЙЧЫК.

1, ПОНЕДЕЛЬНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

17.00. Навіны. **17.10.** Знаёмства з навакольным светам. 2-гі клас. **17.30.** «Каралеўскае паляванне». Шоу-казіно. **18.30.** Дзённік Прынёмання. (Гр.). **18.40.** Веснік гарсавета. (Гр.). **19.00.** Абласныя навіны (Брэст). **19.10.** «Над Нёманам». Праграма на польскай мове. (Гр.). **19.40.** Студыя «Мэта». **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** Спартыўны тэлекур'ер. **21.55.** «Я родам з дзяцінства». Мастацкі фільм. **23.35.** НІКа.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** Мультфильм. **8.40.** Авторская программа В. Молчанова. **9.25.** Брейн-ринг. **10.30, 18.35.** Гол. **14.25.** Телемикст. **15.10.** «Алиса в стране чудес». Мультфильм. 1-я серия. **15.20.** Выбор-200. **16.05.** Стартинэйджер. **16.50.** Технодром. **17.25.** НЭП. **17.55.** Звездный час. **19.10.** Премьера художественного телесериала «Горячев и другие». 5-я серия. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Азбука собственника. **20.50.** «Горячев и другие». 6-я серия. **«Новая студия» представляет: 21.20.** Пресс-клуб. **23.20.** Евгеник... **23.35.** Джем-сейшн. **00.20.** Пресс-экспресс.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Мульти-пульти. **8.05.** Совершенно секретно. **8.55.** Утренний концерт. **9.10.** Золотая шпора. **9.40.** «К-2» представляет... **10.30.** Рек-тайм. **11.00.** «Мечта в другом ключе». Художественный фильм. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** Телевизионный театр России. **14.55.** Премьера документального фильма «Дикая природа Америки». (США). Фильм 1-й. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Студия «Рост». **16.15.** Трансросэфир. **17.00.** Спасение-911. **18.00.** Ключ на старт. **18.20.** Бизнес в России. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** Детектив по понедельникам. Художественный фильм «Сборник блюзов Сент-Луиса». (США). **20.25.** Мисс Пресса-92. **21.00.** Момент истины. **22.20.** Звезды говорят. **22.25.** Спортивная карусель. **22.30.** Референдум. **22.45.** На сессии ВС Российской Федерации. **23.00.** «Перекрестки судеб». Передача 2-я.

ПОЛЬША-I

7.00. Кофе или чай? **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.25.** Дошкольники дома. **10.50.** Поговорим о детях. **11.05.** «Династия». Серия 178. **12.00.** Школа для родителей. **12.20.** Дети это любят. **12.30.** Письма Моцарта. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** Французский язык. Уроки 17-20. **13.45.** Фильм на французском языке. **14.10.** Язык глухонемых. Урок 7. **14.15.** Немецкий язык. Урок 25. **14.45.** Фильм на немецком языке. **15.15.** Итальянский язык. Урок 25. **15.30.** Английский язык. Урок 25. **16.00.** «Спэйтж». Сериал пр-ва Англии. **16.30.** Презентация. **17.00.** Программа на вечер. **17.05.** Программа для подростков. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** «Спэйтж». Сериал пр-ва Англии. **18.50.** Антенна. **19.10.** Сатирическая программа. **19.45.** О программе приватизации. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.00.** Миниатюры. **21.10.** Телетеатр. Ю. Мишима. «Мадам де Сад». **22.55.** Развлекательная программа. **23.30.** Журнал парламента. **23.45.** Вечерние новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** «Победа». Фильм пр-ва Италии.

ПОЛЬША-II

9.00. Панорама. **9.10.** Местная программа. **9.40.** «Таинственное золото города». Мультсериал. **10.10.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **10.35.** Хобби. **11.00.** Английский язык. Урок 51. **11.30.** Развлекательная программа. **11.50.** Пенелопы. **12.00.** Повторение по пожеланиям. **16.55.** Приветствие. **17.00.** Репортаж. **17.30.** Панорама. **17.40.** Спорт. **17.55.** «Таинственное золото городов». Мультсериал. **18.20.** Обзор кинохроник. **18.50.** Польская кинохроника. **19.00.** Местная программа. **19.30.** «Поколения». Сериал пр-ва США. **20.00.** «Спасем планету». Док. фильм. **21.00.** «Алло, алло». Комедийный сериал пр-ва США. **21.30.** Автожурнал. **22.00.** Панорама. **22.25.** Налоги. **22.30.** Спорт. **22.40.** Без обезболивания. **23.05.** «Регина — путь к успеху». Серия 2. **00.00.** Марафон трезвости. **01.00.** Панорама.

2, ВТОРНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.15.** Фільм-канцэрт. «Анатоль Салаўяненка на сцэне і па-за сцэнай...» **9.00.** Знаёмства з навакольным светам. 2-гі клас. **9.15.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **10.05.** Міжнародны турнір па міні-футболу. Фінал. **10.55.** «Я родам з дзяцінства». Мастацкі фільм. **12.35.** «Сцежкамі запаветнымі». Навукова-папулярны фільм. **13.00.** Студыя «Тэлесябры». **13.30, 17.00.** Навіны. **13.40.** Тэлефільм «Спыніся, прыслухайся». **13.55.** «Крэйцэрава саната». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі. **16.30.** Беларуская літаратура. 10-ы клас. **17.10.** МТУ на Беларусі. **17.50.** Дзённік Прынёмання. (Гр.). **18.00.** Прэм'еры кіно. (Гр.). **19.00.** Абласныя навіны (Віцебск). **19.10.** Экзаменная хвала. «Веснавыя клопаты хлебароба». Прымае удзел намеснік старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь А. І. Бокач. Прамая лінія. **20.10.** Міласэрнасць без межаў. **20.25.** Вакальны цыкл Л. Яўтуховіча «Іспанскі сшытак». **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.35.** «Мачаха». Мастацкі фільм. **22.30.** НІКа. **22.45.** Тэлебіржа.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** Кидди-видди. **8.35.** Премьера художественного фильма «Река лжи». 10-я серия (Польша). **9.35.** Миниатюра. **9.50.** «Горячев и другие». Художественный телесериал. 5-я и 6-я серии. **10.50, 01.10.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Мегре у министра». Телеспектакль. Часть 1-я. **12.35.** «Друза». Художественный фильм. **14.25.** Деловой вестник. **14.40.** Мир денег Адама Смита. **15.15.** «Алиса в стране чудес». Мультфильм. 2-я и 3-я серии. **15.35.** Встречи для вас. **16.20.** Ассоциации детского телевидения. IV фестиваль детской эстрадной песни. **17.25.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу «Знакомые незнакомцы». **18.00.** «Река лжи». 10-я серия. **18.55.** Тема. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Репортаж ни о чем. **20.55.** Футбол. Кубок обладателей кубков. 1/4 финала. «Фейеноорд» (Голландия) — «Спартак» (Москва). **23.25.** L-клуб.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** Время деловых людей. **7.55.** Момент истины. **8.50.** Досуг. **9.15.** Музыка крупным планом. **10.05.** Наш сад. **10.35.** Телекроссворд. **11.05.** «Огни большого города». Художественный фильм. (США). **12.30.** Мульти-пульти. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.00.** «Дом Ашеров». Художественный фильм. (США). **15.00.** Телебиржа. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Согрейте вашим добром. **16.15.** Трансросэфир. **17.00.** Хранители истины. **17.30.** Живопись древнего Пскова. **17.45.** Парламентский вестник. **18.45.** Праздник каждый день. **19.25.** Премьера художественного телефильма «Санта-Барбара». 138-я серия. **20.15.** Балет Санкт-Петербурга. **21.00.** Отечество мое. **22.20.** Звезды говорят. **22.25.** Спортивная карусель. **22.30.** Программа «ЭКС». **22.40.** Новый дивертисмент. **23.10.** Музыкальный экзамен.

ПОЛЬША-I

9.00. Здравствуйте. **10.00.** Новости. **10.10.** Мама и я. **10.25.** Дошкольники дома. **10.50.** Поговорим о детях. **11.00.** «Дубровский». Сериал пр-ва СССР. **12.00.** Рынок труда. **12.15.** Приятное с полезным. **12.30.** Народное искусство. **12.45.** Клуб одиноких сердец. **13.00.** Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** Сельскохозяйственная программа. **13.50.** Мир химии. **14.20.** Кухня. **14.35.** «Атмосфера». Документальный сериал. **14.50.** Рисуй с нами. **15.00.** Новости науки и техники. **15.15.** Лаборатория. **15.35.** Играет музыка. **15.50.** Документальный сериал. **16.20.** Мы в космосе. **16.35.** Джайстик. **17.00.** Программа на вечер. **17.05.** Программа для детей. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.25.** «Билл Гоусби шоу». Сериал пр-ва США. **18.50.** Культурно-публицистическая программа. **19.10.** Исторический журнал. **19.40.** О программе приватизации. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **20.55.** 7 минут для министра труда. **21.10.** «Макс и Ферайна». Фильм пр-ва Франции. **23.00.** Публицистическая программа. **23.30.** Журнал развлекательной музыки. **23.45.** Вечерние новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.10.** Беседы с Никодимом. **00.50.** Музыкально-поэтическая программа.

ПОЛЬША-II

